№ 12 (929), сакавік 2023 года

# Як сяляне самі выбіралі сабе суддзяў (маёнтак Зэльва канца XVIII ст.)

***Асноўнай часткай насельніцтва Беларусі часоў феадалізму былі сяляне. Яшчэ са школы мы ведаем, што ў тыя часы іх жыццё было нялёгкім з-за прыгоннага права, паншчыны... З аднаго боку, гэта так, а з другога... прыгоннае права ў Беларусі ў часы Вялікага Княства Літоўскага не мела катэгарычна жорсткіх норм функцыянавання: значная частка сялян мела вольна-непрыгонны стан.***

Варта ўлічваць, што галоўным для чалавека XVI – XVIII стст. было быць роўным у межах свайго саслоўя, сваёй сацыяльнай групы. У тыя часы саслоўныя абмежаванні лічыліся справядлівымі і апраўданымі з пункту гледжання падзелу грамадства на саслоўі. Па тагачасных уяўленнях існуючы парадак, правы, свабоды саслоўяў былі дадзены чалавеку Богам. З цягам часу ўяўленні мяняліся, з'явілася ідэя роўнасці правоў чалавека наогул. І ў гэтым у другой палове XVIII – пачатку XIX ст. вялікую ролю адыграла эпоха Асветніцтва, для якой была характэрна прапаганда свабоды асобы, абароны правоў чалавека.

Але ўсё ж прыгоннае права існавала. Адным з асноўных яго атрыбутаў было права суда ўласніка над сваімі падданымі, зафіксаванае на нашых землях яшчэ агульназемскім прывілеем вялікага князя літоўскага Казіміра і замацаванае Статутамі ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. Згодна з дадзеным правам сялян судзіў ці сам гаспадар – шляхціц, ці прадстаўнікі яго адміністрацыі, таксама шляхціцы.

Але ў дакументах канца XVIII ст. Зэльвенскага маёнтка згадваецца сельскі суддзя селянін Юзаф Мацеевіч, абраны самімі сялянамі суддзёй у 1795 г., які выконваў гэтыя абавязкі на працягу як мінімум двух з паловай гадоў.

Што ж гэта была за пасада? Чаму ўзнікла?

Вось што ўдалося высветліць. Пачнем ад пачатку.

14 красавіка 1795 г. у Ружанах Францішак Сапега (1772 – 1829) падпісаў інструкцыю «Увядзенне сельскіх судоў», якая тычылася яго ўладанняў. Канкрэтныя маёнткі не названыя, але вядома, што згаданаму прадстаўніку чарэйска-ружанскай лініі магнацкага роду Сапегаў належалі на захадзе Беларусі Ружаны (Ражаная), Дзярэчын, Зэльва, Высокае і інш. Францішак Сапега быў неардынарнай асобай. Скончыў Віленскі ўніверсітэт (Віленскую галоўную школу), засвоіў ідэі Асветніцтва, быў генералам артылерыі ВКЛ, кіраўніком паўстання 1794 г. на тэрыторыі Слонімскага, Ваўкавыскага паветаў і ўсходняга Падляшша. Пасля падаўлення паўстання прынёс прысягу на вернасць расійскай імператрыцы Кацярыне ІІ, што дазволіла яму захаваць за сабой свае ўладанні і пазбегнуць іх канфіскацыі.

Вышэйзгаданая інструкцыя, падрыхтаваная для заходнебеларускіх уладанняў Ф. Сапегі, прасякнутая духам Асветніцтва. Ідэя стварэння сельскіх судоў узнікла ў яго дзякуючы рэальнай ацэнкі існуючай ў сялянскім асяроддзі сітуацыі, што адзначаецца ў тэксце. Аўтар падкрэсліў, што колькі б панская адміністрацыя не клапацілася аб паляпшэнні становішча сялян, яны не будуць любіць панскі двор, бо нянавісць да яго *«ўсмоктваюць яшчэ з мацярынскім малаком»*. Прычынамі гэтага былі, на яго думку, малая інфармаванасць сялян аб клопатах панскай адміністрацыі пра іх лёс, частае яе абыходжанне з сялянамі не як з людзьмі, *«а горш, чым з хатняй жывёлай (быдлам)»*. Таму аўтар дакумента лічыў, што сяляне маюць падставы адмоўна ставіцца да дваровай адміністрацыі. Каб не дазваляць аканомам несправядліва судзіць і караць сялян, Ф. Сапега і ўводзіў у сваіх уладаннях інстытут сельскіх судоў.

У вышэйзгаданай інструкцыі адзначалася, што сельскія суды ўводзіліся ў сувязі з тым, што:

*«не бывае чалавека без віны, а таму і начальства ўстаноўлена ад Бога, каб кожная, нават найменшая, правіннасць была без развагі і шкадавання пакарана»*;

***«селянін целам і душой роўны кожнаму чалавеку, якога Бог узнагародзіў розумам і даў яму магчымасць усведамляць, што ёсць добрае, і што ёсць дрэннае»***;

зрабіць селяніна законапаслухмяным можна рознымі сродкамі, *«найперш асветай людзей»*, а не толькі *«неміласэрным біццём»*.

*«Клапоцячыся пра здароўе і дабрабыт сялян»*, землеўласнік Ф. Сапега як *«пан і дабрадзей для сваіх падданых»* і ўводзіў сельскія суды, якія складаліся з сялян і разглядалі іх справы.

Узначальваць такі суд мусіў вясковы войт, які выбіраўся сялянамі і зацвярджаўся панскай адміністрацыяй (*«такім чынам ён стане першым гаспадаром



Францішак Сапега

і першым суддзёй той грамады, у якой з'яўляецца войтам»*). У дапамогу войту з кожнай вёскі планавалася выбіраць па два гаспадары *«богабаязных і вартых даверу, якія б разам з войтам судзілі розныя справы, што ўзнікалі б у іх вёсках»*. Месцам правядзення суда вызначаўся дом войта, а на судовых пасяджэннях павінны былі прысутнічаць як абвінаваўцы, так і абвінавачаныя.

Ініцыятарамі («donosicielami») узбуджэння спраў у сельскім судзе мусілі быць дзясятнікі вёсак. Суд надзяляўся паўнамоцтвамі разглядаць практычна ўсе справы, што маглі ўзнікнуць у вёсцы: ад крадзяжоў да забойства і бунтаў. Разам з тым, рашэнні такіх сельскіх судоў павінны былі зацвярджацца адміністрацыяй уладання.

Правапарушэнні сялян адной вёскі (крадзяжы, бойкі, сваркі, шкоды, зробленыя суседзямі) павінны былі разглядацца судом гэтай жа вёскі. Калі справа тычылася сялян з розных вёсак, але аднаго фальварка, яна разглядалася судом вёскі большай па плошчы і колькасці насельніцтва. Селяніна, які прычыніў якую-небудзь шкоду пад час работы ў панскім двары, павінен быў судзіць суд яго вёскі, а не панская адміністрацыя. Справу на судах прадстаўляў дзясятнік, абавязаны дамагацца справядлівага пакарання вінаватага.

У выпадку спрэчкі селяніна з войтам, памочнікамі-суддзямі, дзясятнікамі справа павінна была разглядацца ў судзе самай вялікай вёскі маёнтка. Калі селянін сам жыў у такой вёсцы, то ён звяртаўся да адміністрацыі ўладання, якая для разгляду справы збірала суд з трох мясцовых сялян-суддзяў.

Апеляцыі на рашэнні сельскіх судоў падаваліся ў панскі двор, дзе яны разглядаліся *«па нязначных справах»*. Пры апеляцыях *«аб важнейшых правіннасцях»*, якія патрабавалі суровага пакарання (за крадзёж у буйных памерах, калецтва ці забойства чалавека, заклікі да бунту, выдзіранне чужых пчол, падпал лесу і інш.), адміністратар уладання павінен быў запісаць сутнасць справы, довады бакоў, пастанову суда, адаслаць справу да вышэйшага мясцовага кіраўніцтва і чакаць пацвярджэння, змянення або адмены прысуду. У інструкцыі асабліва падкрэслівалася, што гультаі і марнатраўцы, якія *«праз ляноту ці п'янства нішчаць сваю маёмасць»*, павінны быць пакараны самым суровым чынам.

У тэксце інструкцыі падкрэслівалася, што злачынствы і правапарушэнні бываюць розныя, таму і **пакаранні павінны адрозніваецца і быць адэкватнымі здзейсненым учынкам**. Пры гэтым адзначалася, што трэба пазбягаць «біцця», якое ўжо ўвайшло ў звычай, а прымяняць гэты від пакарання толькі ў надзвычайных выпадках. Аўтар інструкцыі заклікаў выкарыстоўваць пакаранні, якія прысаромліваюць чалавека і пераконваюць яго ў шкоднасці парушэнняў, спрыяюць паляпшэнню жыцця (*«звычаю»*) і *«робяць селяніна дабрадзейным»*.

Да такіх пакаранняў адносіліся:

ляжанне ў царкве ці касцёле крыжам пад час набажэнства;

выплата ў вясковую касу штрафу (гэта сведчыць, што сяляне мелі сваё самакіраванне са сваімі фінансавымі сродкамі (касай);

выключэнне *«з кампаніі, калі ўся грамада весяліцца»* (напэўна, гэта было для селяніна адным з самых страшных пакаранняў – застацца адзін ніхто не хацеў);

адпрацоўка паншчыны крыўдзіцелем за пакрыўджанага і інш.

У абавязкі дзясятнікаў уваходзіла паведамляць адміністрацыі ўладання пра тое, *«якія сем'і з яго дзясятка жывуць у нязгодзе; у чыіх дамах часцей лаюцца, праклінаюць адно аднаго, амаральна сябе паводзяць; хто з сялян не клапоціцца пра сваю маёмасць, нішчыць гаспадарку праз гультайства ці п'янства; хто не слухае і не выконвае распараджэнняў сваіх дзясятнікаў ці панскай адміністрацыі; хто не сочыць за сваёй гаспадаркай і не хоча працаваць; хто не забяспечвае матэрыяльна свае сем'і, пасылае малых дзяцей у іншыя вёскі "па хлеб"»*; хто распрадае маёмасць, ураджай, жыўнасць – *«крадком выносіць»*; хто несвоечасова і дрэнна апрацоўвае зямлю, *«а тое, што яму ўродзіць зямля»*, не збірае ў час і інш.

На жаль, аб дзейнасці сельскіх судоў у маёнтках Ф. Сапегі звестак выяўлена няшмат. Але згадка сельскага суддзі Юзафа Мацеевіча ў маёнтку Зэльва сведчыць, што сельскія суды Ф. Сапегам былі ўведзены і функцыянавалі, па меншай меры, у Зэльве. Гэта ў сваю чаргу гаворыць пра тое, што ў канцы XVIII ст. рабіліся спробы змяніць да лепшага становішча сялянства, хоць і з меркавання аб лепшым землеўласніка, а не земляроба. Рэгламентацыя сацыяльнага жыцця сельскага насельніцтва разумелася як радыкальнае паляпшэнне яго становішча. Інструкцыя аб увядзенні сельскіх судоў была накіравана на такое «паляпшэнне» становішча сельскага насельніцтва, праўда, у разуменні паноў, а не саміх сялян. Але, аб'ектыўна, увядзенне сельскіх судоў для сялян варта лічыць прагрэсіўнай з'явай.

*Аляксандр ДОЎНАР*